# Чытаем разам

**У** рамках *Свята беларускай пісьменнасці* ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф.Карскага 8 верасня прайшоў чацвёрты этап абласной акцыі **«Чытаем разам»**. Ініцыятары мерапрыемстваў – галоўнае упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама і абласная бібліятэка.



У гэты дзень ва ўсіх публічных бібліятэках аддалі даніну памяці і павагі вялікім класікам беларускай літаратуры – ***Янку Купале і Якубу Коласу*** – знакамітыя людзі Гродзеншчыны, пісьменнікі, студэнты, школьнікі, а таксама ўсе жадаючыя.

На сустрэчы гучалі біяграфічныя звесткі аб народных паэтах, песні, напісаныя на іх вершы, урыўкі з іх твораў.

Свае любімыя вершы прачыталі намеснік начальніка упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, начальнік упраўлення па ўзаемасувязі са СМІ, па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Вячаслаў Апановіч, а таксама начальнік упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Сонгін. Усіх – і чытачоў, і тых, хто прыйшоў паслухаць творы, яднала адно: сапраўдная класічная беларуская літаратура.

Вядома, што Якуб Колас і Янка Купала – сучаснікі, паплечнікі, аднагодкі, тыпалагічна блізкія пісьменнікі. Яны стварылі сапраўдныя шэдэўры нацыянальнага мастацтва і тым самым узнялі беларускую літаратуру да ўзроўню перадавых літаратур свету, зрабілі яе агульнанароднай з'явай, адным з больш важных і дзейсных сродкаў маральнага і эстэтычнага выхавання будучых пакаленняў. Гэта гістарычная заслуга Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Наша літаратура – наш гонар, тая галіна духоўнай дзейнасці, у якой беларусы найбольш яскрава праявілі сябе як нацыя. Купала і Колас зазірнулі ў душу беларусаў, паказалі іх характар, выказалі спадзяванні і надзеі, спрадвечную прагу "людзьмі звацца". З гэтымі па-сапраўднаму нацыянальна значнымі імёнамі нашых класікаў наўпрост звязаная лёсавызначальная сутнасць беларускай літаратуры, яе эпахальныя дасягненні. Якуб Колас і Янка Купала былі выразнікамі нацыянальнай самасвядомасці, народных спадзяванняў і пачуццяў. У сваіх творах пісьменнікі шырока раскрывалі нацыянальны характар, асаблівасці жыцця беларусаў.

– Галоўная задача акцыі – папулярызацыя беларускай літаратуры, – адзначыла дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Карскага Лідзія Мальцава. – Выдатна, што ў ёй прымаюць удзел чытачы рознага ўзросту і дзейнасці.

Акцыя працягваецца. Далучайцеся!

***Таццяна Сілкова***
***Фота аўтара***